# Эколагі склалі «чорны спіс».

Віцебскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя склаў «чорны спіс» арганізацый і прадпрыемстваў, якія парушаюць прыродаахоўнае заканадаўства.

— Вінаватым вынесеныя абавязковыя прадпісанні аб ліквідацыі парушэнняў, яны аштрафаваныя. Ім прад'яўленыя прэтэнзіі аб кампенсацыі шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю, — паведаміў Юрый КАРАЛЁЎ, начальнік аддзела аператыўнага кантролю Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. — Самі спісы састаўляюцца, пачынаючы з 2012 года. І калі раней у іх былі назвы некалькіх прадпрыемстваў, то сёлета — больш за 10. За паўгоддзе падчас маніторынгу прааналізуем, што зроблена парушальнікамі па выпраўленні сітуацыі. І можам выдаліць назву.

Дык каго і за што ж канкрэтна ўнеслі ў спіс? Сярод парушальнікаў нямала і прадпрыемстваў сістэмы ЖКГ.

«Дзісенскі лясгас» «атрымаў славу» за несанкцыянаванае захаванне 7 тон адходаў дрэваапрацоўкі ў кар'еры для здабычы пяску. Гарадоцкім прадпрыемствам меліярацыйных сістэм дапушчана 5 фактаў несанкцыянаванага захавання будаўнічых адходаў пры зносе будынкаў і памяшканняў. За бруджванне водных аб'ектаў было дапушча на КУП «Браслаўкамунальнік». УП ЖКГ Шумілінскага раёна ажыццяўляла скід за бруджвальных рэчываў (сцёкавыя воды) у рэчкі Баброўка і Пахучка. А на прадпрыемстве ЖКГ «Лепель» не аднаразова перавышалі нарматывы выкідаў у паветра (азоту дыяксіду і вугляроду аксіду). Дарэчы, тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды сярод іншага магчыма і прыпыненне эксплуатацыі асобных установак, цэхаў, аб'ектаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

**Источник:** Звязда. — 2016. — № 39 (1 сак.). — С. 6.